# ЗАКЛЮЧЭННЕ

**савета па абароне дысертацый Д 02.21.03 па дысертацыі Талмачовай Святланы Аляксандраўны «Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.)»**

**Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджаецца ступень.**

Дысертацыя Талмачовай С. А. «Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.)» адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя і галіне навук – гістарычныя.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай праблемы з ацэнкай яго значнасці.**

У дысертацыі ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі раскрыты працэс стварэння і дзейнасць спецыяльных мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па ажыццяўленні аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі з 1861 г. да пачатку Першай сусветнай вайны. Ахарактарызавана дзейнасць міравых пасрэднікаў, павятовых з'ездаў міравых пасрэднікаў, губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей, паверачных камісій, павятовых па чыншавых справах прысутнасцей, павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей, земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў, губернскіх прысутнасцей, павятовых і губернскіх землеўладкавальных камісій па рэалізацыі аграрных пераўтварэнняў у краі і іх выніковасць.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку прысуджана вучоная ступень.**

Савет па абароне дысертацый Д 02.21.03 прысуджае Талмачовай Святлане Аляксандраўне вучоную ступень доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя **за:**

– канцэптуальную распрацоўку новага кірунку ў гістарыяграфіі, што знайшло сваё ўвасабленне ў комплексным даследаванні ролі і месца мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання ў працэсе рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі ў 1861 – 1914 гг.;

– абгрунтаванне этапаў аграрнай палітыкі расійскага ўрада: 1) – люты 1861 г. – кастрычнік 1906 г.; 2) лістапад 1906 г. – пачатак Першай сусветнай вайны і перыядызацыі стварэння і дзейнасці спецыяльных органаў кіравання па рэалізацыі гэтай палітыкі (1861–1878 гг. – інстытут міравых пасрэднікаў, іх павятовыя з'езды, губернскія па сялянскіх справах прысутнасці ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, а ў 1861–1903 гг. – у Віленскай і Гродзенскай губернях; 1863–1867 гг. – паверачныя камісіі ў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і інфляндскіх паветах Віцебскай губерні; 1878–1901 гг. – павятовыя і губернскія па сялянскіх справах прысутнасці ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях; 1886–1917 гг. – павятовыя па чыншавых справах прысутнасці ва ўсіх беларускіх губернях; 1901–1917 гг. – інстытут земскіх начальнікаў і іх з'езды, губернскія прысутнасці ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, а ў 1903–1917 гг. – у Віленскай і Гродзенскай губернях; 1906–1917 гг. – павятовыя, 1907–1917 гг. – губернскія землеўладкавальныя камісіі).

– раскрыццё структуры (міравыя пасрэднікі, павятовыя з'езды міравых пасрэднікаў, губернскія па сялянскіх справах прысутнасці, паверачныя камісіі) мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрных рэформ 1861 г. і 1866 г. і выніковасці іх дзейнасці пры зацвярджэнні ўстаўных грамат, з 1863 г. – выкупных, з 1867 г. – люстрацыйных актаў з пераводам памешчыцкіх і казённых сялян на абавязковы выкуп з паніжэннем выкупных плацяжоў і павелічэннем, у большасці выпадкаў, зямельных надзелаў;

– аналіз дзейнасці рэфармаваных паводле закону 1874 г. мясцовых органаў кіравання (губернскія і павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях) і створаных па закону 1886 г. павятовых па чыншавых справах прысутнасцей з выяўленнем і абгрунтаваннем прычын маруднасці ажыццяўлення аграрных пераўтварэнняў (калегіяльнасць губернскіх і павятовых прысутнасцей з адным ці двума штатнымі чыноўнікамі, павелічэнне колькасці спраў па пазямельным уладкаванні спецыфічных толькі для заходніх губерняў сацыяльных груп саслоўя сельскіх абывацелей, нежаданне ўрада фінансава падтрымліваць чыншавую шляхту і інш.);

– доказ таго, што ўвядзенне інстытута земскіх нальнікаў па правобразу міравых пасрэднікаў 1861–1863 гг. не адпавядала рэаліям часу (сумяшчэнне ў адной асобе адміністрацыйных і судовых функцый, ліквідацыя міравога суда ў сельскай мясцовасці, жорскі кантроль над органамі сялянскага самакіравання), асабліва з пачаткам сталыпінскай аграрнай рэформы, якая прадугледжвала разбурэнне пазямельнай абшчыны і стварэнне прыватных сялянскіх гаспадарак з наданнем сялянству ўсіх грамадзянскіх правоў;

– характарыстыку механізму ўзаемадзеяння павятовых і губернскіх землеўладкавальных камісій, земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў, губернскіх прысутнасцей у працэсе рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы і абгрунтаванне яе выніковасці на тэрыторыі Беларусі;

– выяўленне рэгіянальнай спецыфікі, асаблівасцей стварэння (розначасовасць і рознапрасторавасць для беларускіх губерняў) і функцыявання мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрных пераўтварэнняў і, пачынаючы з 1864 г., камплектавання іх кадравага складу пераважна асобамі рускага паходжання, а таксама стварэння і дзейнасці не тыпічных для рускіх губерняў устаноў – паверачных камісій і павятовых па чыншавых справах прысутнасцей.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў даследавання.**

Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы абагульняючых навуковых работ, вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў, спецкурсаў па гісторыі Беларусі і і Расіі другой паловы XIX – пачатку XX ст. Практычнае значэнне навукова-абгрунтаваных высноў дысертацыі заключаецца і ў наданні канцэптуальна новага ракурсу даследаванням па аграрнай гісторыі Беларусі і Расіі на аснове выяўлення сутнасці ўрадавай палітыкі, эфектыўнасці дзейнасці інстытутаў дзяржаўнага кіравання па яе рэалізацыі і ступені ўплыву на мадэрнізацыйныя працэсы ў сацыяльна-эканамічнай сферы. Матэрыялы даследавання могуць быць запатрабаваны органамі дзяржаўнага кіравання, гістарычнымі і этнаграфічнымі музеямі Рэспублікі Беларусь.

Намеснік старшыні
савета па абароне дысертацый — Г.У.Карзенка

В.а. вучонага сакратара
савета па абароне дысертацый — І.В.Варывончык